Пры клубе "Спадчына" існуе паэтычны гуртык, якім кіруе аўтарка гэтых радкоў. Мы ўжо выдалі з нашымі юнымі паэтамі пяць нумароў сваёй газеты . За шэсць гадоў існавання гуртка творы дзяцей друкаваліся ў такіх рэспубліканскіх выданнях як "Раніца", "Бярозка", "Настаўніцкая газета", а таксама ў мясцовым друку і іншых выданнях.

Пасылайце сваіх дзетак у першы беларускамоўны клас дзесятай школы ў наступным навучальным годзе, не пашкадуеце!

Таццяна ТРАФІМЧЫК, настаўніца СШ №10

ВОПРОС – ОТВЕТ

ПОЧЕМУ В СЛОНИМЕ ОДИН ВРАЧ-УРОЛОГ?

Здравствуйте! Не так давно мне пришлось столкнуться с одной деликатной проблемой. У моего мужа обнаружили аденому простаты.

В Слониме на всех больных — один врач-уролог – Слезник. Талончик к нему на прием очень трудно достать, так как на весь день на всех больных выдаются всего лишь 5 штук.

Мы всеми правдами и неправдами все-таки достали этот талончик, так как мужу очень срочно нужна была медицинская помощь.

Посидев в очереди у кабинета, я поняла, как этому врачу все-таки трудно работается. Человек не может разорваться между приемом и операциями.

В прошлый раз, когда мы с мужем ходили к нему на прием, врач опоздал на 1,5 часа. Он прибежал с операции. Потом, приняв несколько человек в течение 40 минут, снова ушёл в операционную.

У меня вот такой вопрос: почему в нашем городе всего лишь один врач-уролог?

С уважением, М.Н. (свою фамилию умышленно не называю, так как не хочу выставлять свои личные проблемы на всеобщее обозрение).

На вопрос нашей читательницы отвечает главный врач территориального медицинского объединения Юрий Петельский.

"По штатному расписанию, утвержденному Министерством Финансов и согласованному с Министерством Здравоохранения Беларуси, у нас в больнице должен работать один врач-уролог. Прием у него длится 3 часа 50 минут в день. Хочу отметить, что в больнице все врачи работают с перенагрузкой. А вообще-то, у нас и хирурги могут посмотреть больных подобного рода", — сказал Юрий Владимирович.

РИТУАЛ

НЕ УМИРАЙТЕ, ПОКА ЖИВЫ

■ Ольга ШИНКЕВИЧ

"Сейчас такая дорогая жизнь стала! Столько денег уходит, чтобы прокормить семью, оплатить коммунальные услуги, купить самые необходимые вещи и т.д.!" — слышится сегодня со всех сторон.

Да, жить — дорого. Как, впрочем, и умереть...

На сегодняшний день в Слониме работает около 6 магазинов ритуальных услуг. В принципе, цены на все похоронные принадлежности в них практически одинаковые. Гробы деревянные с наружной и внутренней драпировкой и декоративным украшением стоят в пределах от 53 000 до 58 000 рублей. Несколько лет назад Слонимская фабрика "Гостиничная мебель" делала и экспортировала гробы в Среднюю Азию, Россию. Тогда, по словам нынешнего директора фабрики Валерия Лагутика, они стоили 100 долларов. На сегодняшний день предприятие также производит "тонированные" гробы из сосны по цене 78 000 рублей за штуку. В месяц рабочие фабрики делают их около ста штук.

Венок стоит от 4 270 до 23 410 рублей. Корзинки с искусственными цветами — от 5000 до 15 760, "живые" траурные букеты — около 3110 рублей. Накидка обойдется в 2 350 рублей, покрывало — 3 380 рублей, подушка — также 3380 рублей. Крест деревянный православный стоит 3560 рублей, католический — 3010 рублей. Табличка на крест — 2240 рублей, лента — 120-325 рублей. Ну, и лампадки — от 1200 до 2500 рублей.

В некоторых магазинах ритуальных услуг можно даже заказать автобус (15 950 рублей) и катафалк (от 13 890 — до 19 270 рублей).

Обычно у нас в стране организацией похорон занимаются близкие родственники умершего. Убитым горем людям приходится думать о том, где и за сколько можно купить ритуальные принадлежности. И как похоронить усопшего, чтобы все было, "как у людей"?


Фота Віталя ГІЛЯ

Старые захоронения возле церкви в д. Острово

Что ж, в каждой стране — свои особенности похоронного обслуживания. В Чехии, например, существует централизованное предоставление гражданам комплекса услуг и похоронных принадлежностей только в одном учреждении — в похоронном бюро, которое именуется "погребальная служба". Сотрудники этой службы полностью освобождают граждан, понесших тяжёлую утрату, от всех забот, связанных с организацией похорон, изготовлением и установкой памятника.

Погребальная служба предоставляет гражданам более 40 видов услуг, в том числе обеспечение гостиницей и питанием людей, приехавших на похороны из других мест проживания, и обратным билетом на поезд или автобус. Швейная промышленность специально выпускает недорогую одежду для обряжания умерших. В отличие от магазинов похоронных принадлежностей в городах нашей страны, в похоронных бюро Чехии принадлежности и предметы ритуала не продаются и их образцы не выставляются. Комплект похоронных принадлежностей доставляется к месту нахождения умершего. Сохранение умерших до похорон ни в жилых зданиях, ни в больницах не практикуется. Из жилых зданий и патологоанатомических отделений больниц умершие перевозятся без сопровождения родственников, спецавтотранспортом погребальной службы в траурный зал или в крематорий, где они содержатся до похорон в охлаждённом помещении в гробах. Таким образом, ни одни похороны не начинаются из дома или больницы. Родственники умершего и другие участники похорон прибывают прямо в крематорий или в траурный зал на торжественно-траурный церемониал прощания.

Расположенные на кладбищах траурные залы используются независимо от последующего за церемониалом прощания способа погребения. В одних случаях после обряда процессия направляется к месту погребения на кладбище, в других — гроб отвозится в ближайший крематорий без сопровождения родственников умершего. Из крематория урна с прахом доставляется на кладбище, которое заранее определили родственники. Погребальную урну с прахом хоронят в земле или пепел развевают на специальной поляне на кладбище. Радиус кремационного обслуживания до 50 км.

Использование кремации выгодно как похоронным организациям, так и клиентам. Похоронные фирмы экономят полезную площадь на кладбище, а клиентам кремация даёт возможность значительно удешевить похороны своих близких. Новшество, характерное именно для Чехии, — использование специальной поляны для развеивания пепла.

Высоким уровнем похоронного обслуживания населения отличаются Германия, Англия, Швеция, Австрия, Франция. В Англии и США первый этап обслуживания осуществляется в так называемом Похоронном доме, в котором проводится комплекс работ по подготовке умерших, включая сохранение в охлаждаемых камерах до похорон. Похоронный дом используется двояко: в одних случаях после обряда прощания в траурном зале автомобильный кортеж направляется на кладбище для захоронения гроба; в других — участники похорон с гробом следуют на автомашинах в крематорий, в траурном зале которого совершается торжественно-траурная церемония прощания.

Во Франции умерших в основном кремируют. Родственники умершего имеют возможность арендовать нишу в колумбарии или участок на кладбище под могилу. Нишу можно арендовать на 5, 10 или 25 лет. Существует также и целевая сумма, которая платится за то, что урна будет там находится постоянно.

Усопших обычно захоранивают в семейные склепы, проектируемые и сооружаемые в неповторимом стиле. Семейные склепы — это одна из особенностей погребальной культуры Франции.

Захоронение в склепе — это самый дорогостоящий вид захоронения, но именно учитывая многовековые традиции французы очень часто хоронят своих близких в семейных склепах. Похоронные фирмы в этом случае получают доход не только от непосредственного захоронения, но и от проектирования склепа, и от ухода за склепом, и ещё за целый спектр сопутствующих услуг.

Во Франции существуют дома прощания. Туда забирают тело из морга и хранят в специальном помещении, оборудованном холодильными камерами. Имеются специальные залы, где установлены гробы и звучит органная музыка. Родственники могут находиться при усопшем круглосуточно.

Отличительной особенностью погребальной культуры Швеции является организация работы кладбищ (в Швеции почти нет колумбарных стен и захоранивают в могилу гроб или урну). Под захоронение отводится стандартный участок без оград, отсутствие оград позволяет экономить до 20 % территорий кладбища, которая отводится под прилегающие дорожки. Участок под захоронение арендуется сроком на 25 лет.

Стоимость стандартного обряда похорон составляет около 15 тысяч шведских крон, приблизительно 2 тысячи долларов США. В эту сумму входит: одежда для умершего, санитарная обработка тела, транспорт, оформление документов, некролог в газете, отпевание, венок, гроб или урна для праха.

Что ж, как говорится в латинской пословице, Memento mori — помни о смерти... ■

СТАРОСТЬ НЕ РАДОСТЬ

ГЕЙДАРА АЛИЕВА СГЛАЗИЛИ В ПРЯМОМ ЭФИРЕ

На прошлой неделе президенту Азербайджана Гейдару Алиеву стало плохо. Это произошло при большом стечении народа на торжественном заседании в бакинском Дворце республики, посвященном 30-летию военного училища имени Джамшида Нахичеванского.

Около 17.00 по московскому времени Гейдар Алиев вышел на сцену, чтобы произнести речь. Он говорил примерно полчаса. И вдруг схватился двумя руками за сердце и прерывающимся голосом произнес: "Что... что со мной происходит?" Возникло замешательство. Тележурналисты отвели камеры в стороны. К президенту тут же бросились охранники, которые на руках вынесли его со сцены. Трансляция торжественного заседания была прервана. Но спустя десять минут президент под гром аплодисментов вернулся на трибуну. "Когда я говорил, я очень волновался и переживал, ибо военное училище имени Нахичеванского — это очень дорогое для меня дитя. Когда же я говорил, на меня смотрели не только друзья, но и те, кто недолюбливает. Эти люди меня и сглазили", — пошутил Гейдар Алиев.

Он проговорил еще около 15 минут. Трансляция была вновь возобновлена. Но было видно, что президент держится из последних сил. Внезапно он неловко вскинул руку и безуспешно попытался опереться о трибуну. Потеряв сознание, Гейдар Алиев упал, ударившись головой о сцену. Телохранители вновь унесли его за кулисы. Тем временем охрана оцепила зал, чтобы никто не мог выйти наружу.



Гейдар Алиев

Трансляция вновь была прервана. Через 15 минут Гейдар Алиев снова появился на сцене. Правда, на этот раз он выступать не стал, а лишь ограничился фразой: "Я желаю всем здоровья, счастья и успехов", после чего уже окончательно ушел со сцены под аплодисменты присутствующих.

Как сообщила позднее пресс-служба президента Алиева, его недомогание было вызвано резким снижением артериального давления. Глава Азербайджана был доставлен домой и, по сообщениям источников в его администрации, "за медицинской помощью не обращался". Наблюдатели не исключают, однако, что в ближайшее время в Баку прибудут врачи из известной турецкой клиники Гюльхана, как это уже случалось, или же господин Алиев сам отбудет в Анкару для прохождения лечения в стационарных условиях. Ситуация в Баку вечером оставалась нормальной. Нервозности в городе не наблюдалось, телевидение и радио работали в прежнем режиме.

ВРАЧЕБНОЕ ДОСЬЕ

В 1999 году в клинике американского города Кливленда президенту Азербайджана была сделана операция по аортокоронарному шунтированию. В той же клинике в 2000 году господин Алиев проходил длительный курс лечения (в Баку было объявлено, что там он лечился от простуды). В начале 2002 года, приняв участие во Всемирном экономическом форуме в Нью-Йорке, Гейдар Алиев вновь лег в кливлендскую клинику, где ему сделали операцию на предстательной железе. В феврале нынешнего года по окончании визита в США президент Азербайджана вновь отправился в Кливленд, где ему прооперировали паховую грыжу. 10 мая этого года Гейдару Алиеву исполняется 80 лет.

"КоммерсантЪ"

СПАДЧЫНА

УШАНУЕМ НАШЫ ГІСТАРЫЧНЫЯ СІМВАЛЫ

Даўно цікаўлюся даведачнай літаратурай, асабліва той, якая выходзіць у выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі".

Па магчымасці, гэтую літаратуру набываю для сямейнай бібліятэкі. З вялікім жаданнем я набыў два першыя тамы доўгачаканай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі".

Калі я ў кнігарні ўзяў у рукі трэці том ЭБГ, сваім вачам не паверыў: ці тое выданне трымаю ў руках? А справа ў тым, што на вокладцы першых двух тамоў змешчана выява "Пагоні" – старажытнага беларускага герба, а пачынаючы з трэцяга тома рэдакцыйная калегія палічыла чамусьці "Пагоню" не друкаваць. Мяне гэта вельмі здзівіла, чаму нават у гістарычным даведніку няма месца сапраўднаму гістарычнаму факту. А з'явіўся ў друку трэці і наступныя тамы ЭГБ пасля травеньскага (1995 г.) рэферэндума.

На працягу 85 гадоў у Беларусі некалькі разоў мянялі дзяржаўную сімволіку. Палякі, нашы суседзі, на працягу стагоддзяў не мянялі сваю дзяржаўную сімволіку. Нават у часы, калі кіравала камуністычная партыя, дзяржаўнымі сімваламі былі белы арол, чырвона-белы сцяг і гімн "Ешчэ Польска не згінэла". У палякаў іншыя адносіны да сваіх дзяржаўных сімвалаў, традыцый, гістарычнай спадчыны, мовы і культуры, чым у беларусаў.

Гербу "Пагоня" больш за 700 гадоў. Яго гісторыя пачынаецца з 13 стагоддзя. "Пагоня" была дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўскага. Ягайла (1348-1434), стаўшы польскім каралём, аб'яднаў у адным гербе "Пагоню" і арла, хоць нярэдка ўжываў іх і паасобку. "Пагоня" была на 30 (з усіх 40) сцягах (харугвах) атрадаў Вялікага княства Літоўскага, якія ўдзельнічалі ў Грунвальдскай бітве (1410).



Здымаюць "Пагоню" з Дома ўраду

Паводле звестак храністаў 16 стагоддзя Б.Папроцкага і А.Гваньіні, малюнак "Пагоні" быў на харугвах Мінска, Навагрудка, Мсціслава, Віцебска, Смаленска, Вільні, Трокаў, Драгічына; Берасцейскага, Мсціслаўскага, Мінскага, Вілейскага, Навагрудскага ваяводстваў; Полацкага і Рэчыцкага паветаў. З 1652 года "Пагоня" – герб Слуцка.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў канцы 18 ст. урад Кацярыны II надаў герб "Пагоня" шэрагу беларускіх гарадоў – Магілёву, Віцебску, Гарадку, Дрысе, Лепелю, Полацку, Рэчыцы, Суражу, Чэрыкаву, Беларускаму гусарскаму палку (1773).

"Пагоня" была адлюстравана ў гербах Гродзенскай, Віленскай і Віцебскай губерній; Ашмянскага, Вілейскага, Дзісенскага і Лідскага паветаў. "Пагоняй" карысталіся таксама Гродзенскі лейбгвардыі гусарскі полк, Полацкі мушкецёрскі полк і іншыя.

"Пагоню" выкарыстоўвалі паўстанцы 1794, 1830-31, 1863-64 гадоў. Герб "Пагоні" прысутнічаў у Вялікадзяржаўным гербе Расійскай імперыі, дзе атаясамліваўся з Полаччынай, Віцебшчынай, Віленшчынай і Беласточчынай. Пасля абвяшчэння ў 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспублікі быў яе гербам. З верасня 1991 да чэрвеня 1995 "Пагоня" была дзяржаўным гербам Рэспублікі Беларусь.

Некалькі гадоў ужо ў нашай краіне ў траўні месяцы на дзяржаўным узроўні адзначаецца свята дзяржаўнага сцяга і герба Рэспублікі Беларусь. У гэты дзень не шкодзіла б хаця б адзін раз у год разам з сучаснымі атрыбутамі дзяржавы вывешваць нашы старадаўнія дзяржаўныя сімвалы – бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоню". Гэта было б добрым напамінкам нашчадкам аб нашай багатай гісторыі, аб нашых слаўных продках, якія змагаліся за незалежнасць і дабрабыт Бацькаўшчыны.

Іван КОБАН,
жыхар г. Слоніма

НАВІНЫ КНІГАРНІ

КРАСА І СІЛА ПАЭЗІІ

У Мінску выйшла з друку першая грунтоўная аўтарская анталогія беларускай паэзіі XX стагоддзя "Краса і сіла".

Такой унікальнай кнігі ў Беларусі яшчэ не было.

Складальнікам анталогіі і аўтарам слоў пра кожнага паэта з'яўляецца наш зямляк з Зэльвеншчыны Міхась Скобла.

Унікальнасць новага выдання заключаецца ў тым, што пад адну вокладку сабраны самыя лепшыя вершы 358 беларускіх паэтаў XX стагоддзя.

Ва ўступным слове да кнігі Міхась Скобла напісаў, што "складаючы анталогію, я зразумеў, што беларусы – нацыя паэтаў... Сёй-той, магчыма, не пагодзіцца з характарыстыкай уласнай творчасці, дадзенай на старонках гэтае кнігі. Дапускаю таксама, што выклікае пярэчанні мая ацэнка пэўных падзей у грамадскім жыцці таго ці іншага творцы...". Тым не менш, на складальніка анталогіі крыўдаваць не варта, бо Міхась Скобла добра ведае і разбіраецца ў літаратуры, а тым больш у паэзіі. І вершы тых паэтаў, якія не трапілі ў анталогію паэзіі XX стагоддзя, відаць, проста слабыя ва ўсіх мастацкіх адносінах да вершаванага твора.

Шырока прадстаўлена на 880 старонках анталогіі паэзія слонімскіх літаратараў. Яе распачынае старэйшы паэт са Слоніма Гальяш Леўчык. У згадцы пра паэта Міхась Скобла сказаў: "Самы славуты верш Гальяша Леўчыка – "Хто адрокся сваіх" (1912). У Заходняй Беларусі яго ведалі на памяць тысячы простых людзей, а падчас Другой сусветнай вайны друкавалі на ўлётках і ў падпольных выданнях як партызанскі фальклор...".

Акрамя Гальяша Леўчыка ў анталогію ўвайшлі вершы Анатоля Іверса, Сяргея Дарожнага, Міколы Арочкі, Сяргея Чыгрына, Васіля Супруна, Алега Лойкі і Івана Чыгрына.

Міхась АКУЛКА

РЫХТУЕЦЦА ПЕРАВЫДАННЕ КНІГІ ПРА ТЭАТР АГІНСКАГА

Дзесяць гадоў назад у Мінску выйшла кніга Анджэя Цеханавецкага "Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме" у перакладзе з нямецкай мовы на беларускую нашага земляка Уладзіміра Сакалоўскага.

Кніга тады імгненна разышлася. Таму многія чытачы не змаглі яе купіць.

Як паведаміў нашаму карэспандэнту Уладзімір Сакалоўскі, сёлета кніга пра тэатр Агінскага ў Слоніме зноў будзе перавыдадзена.

Перавыданне гэта павінна атрымацца больш якасным, дапоўненым і са здымкамі. Ды і фундатар кнігі ўжо ёсць.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЮБИЛЕЙ

ДЕСЯТЬ ЛЕТ С БИБЛИОТЕКОЙ

На улице Коссовский тракт в Слониме недавно отмечали праздник — городской библиотеке №4 исполнилось десять лет.

По итогам областного конкурса коллектив библиотеки недавно был награждён почётной грамотой и ценным подарком.

Такого результата мы добились, благодаря нашим прекрасным работникам.

Например, Фоменко Елена Викторовна умеет со вкусом и эстетично оформить книжную выставку. Провела немало интересных мероприятий с детскими читателями.

А с приходом Валентины Борисовны Пучковой работа с читателем встала на качественно новый уровень.

Жанна Александровна Теренина обслуживает читателей на абонементе. Она имеет прекрасную черту – расположить читателя так, что он, как на исповеди, расскажет всё о себе, в этом призналась одна из читательниц.

В нашем коллективе трудится милая женщина Ирина Васильевна Цимбалиста – наша техничка. Благодаря ей, в нашей библиотеке всегда чисто и уютно.

Коллектив библиотеки стремится восполнять дефицит добра в нашем обществе и не отступать от своей миссии – нести духовную культуру людям. И каждый читатель в библиотеке самый желанный и дорогой.


Юбилей библиотеки отметили вместе с читателями

Благодаря нашему читателю, поэту-любителю Леониду Грушко, при библиотеке четвёртый год работает клуб «Лира». Неоднократно в библиотеке делали выставки своих изделий из соломки, природного материала, макраме, вышивки мастерицы Т.В.Исакова, Т.В.Буланова, О.И.Артёмченко.

Много тёплых слов можно сказать в адрес художника-оформителя В.П.Флейшина. Он буквально преобразил детский уголок «Удивительный мир сказок». А Светлане Косач мы особенно благодарны за оформление наших альбомов.

Хочется отметить, что все годы семья Янушевич («Графъ-фото») – не только наши читатели, но и постоянные спонсоры, так как и руководитель диско-бара "Оскар" Михаил Рудак.

Нина ГРАБОВСКА,
заведующая городской библиотекой №4 г. Слонима

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

ПЕРАВАГУ ТАК І НЕ РЭАЛІЗАВАЛІ

"КАМУНАЛЬНІК" (СЛОНІМ) — "БЯРОЗА" — 0:0

27 красавіка. Слонім. Стадыён "Юнацтва". Суддзя: М. Пырэеў (Мінск). 3 000 гледачоў.

"Камунальнік": Канашэвіч, Скляр, Плют, Горбач, Цішчанка, Варанцоў (83, Зюлеў), Срыбненка (79, Місюк), Астапчык, Пазняк (74, Яўсеенка), Анячэнка (К), Цыганенка.
Папярэджанні: Аначэнка, 6; Куцы, 89.
Вуглавыя: 5 (1+4) — 1 (1+0).
Удары па варотах: 16 (10+6) — 5 (1+4).
Удары ў "рамку": 7 (4+3) — 1 (0+1).
Афсайды: 2 (1+1) — 2 (1+1).
Фалы: 11 (5+6) — 14 (9+5).



Спякотна была ля варотаў "Бярозы" у першым тайме

Першы хатні матч у сезоне-2003 слонімскаму "Камунальніку" выпала правесці супраць вельмі нязручнага для сябе саперніка, футбольнага клуба "Бяроза". Бо тры апошнія гульні ў Слоніме з гэтай камандай завяршыліся перамогамі гасцей. (Баланс сустрэч: +4=1-3, мячы — 13:9 (у Слоніме: +1=0-3, 4:7).

Менавіта таму і матч другога тура сёлетняга чэмпіянату абяцаў быць напружаным. Так яно і атрымалася. Гаспадары поля не сталі доўга развaжаць і адразу ж пайшлі ў атаку. Ужо на другой хвіліне гульні Срыбненка з ліміі штрафной плошчы прабівае па варотах бярозаўцаў, але мяч ляціць вышэй штангі.

Наступныя 10 хвілін сустрэчы акрэслілі безумоўную перавагу слонімскіх футбалістаў над сваімі сапернікамі. На флангах не давалі спакою абаронцам "Бярозы" Варанцоў і Анячэнка, на вастрыні атакі нядрэнна выглядалі Цыганенка і Пазняк. Здаецца, лепшым у складзе слонімцаў у першым тайме быў Іван Срыбненка. На 8-й хвіліне ён меў шанц завяршыць голам вострую атаку, якую распачалі Варанцоў і Анячэнка. А на 29-й хвіліне Іван Срыбненка, атрымаўшы мяч на падыходзе да штрафной плошчы гасцей, стрэліў па варотах "Бярозы" метраў з трыццаці. Толькі перакладзіна выратавала гасцей ад гола.

Былі яшчэ добрыя моманты і ў Цішчанкі, і ў Варанцова, і ў Анячэнкі. Але мяч упарта не жадаў трапляць у вароты бярозаўцаў. Госці ж у першым тайме здолелі правесці толькі адну больш менш асэнсаваную атаку, якая, дарэчы, поспеху ім не прынесла.

Другая палова сустрэчы пачалася больш лагодна. Разбуральныя дзеянні абаронцаў абедзвюх каманд не давалі форвардам выйсці на ўдарную пазіцыю. Засмучаныя было балельшчыкі ўзарваліся, калі на 68-й хвіліне Дзмітрый Анячэнка прайшоў па правай броўцы, наблізіўся да варотаў гасцей і прабіў у бліжні вугал. Варатар "Бярозы" гэты мяч здолеў адбіць, а вось капітан слонімцаў на дабіванні згуляў не лепшым чынам, — мяч прасвістаў побач са штангай.

І зноў пайшла вязкая гульня. Мокрае, цяжкае поле не давала магчымасці нашым футбалістам праявіць свае хуткасныя якасці і тэхнічную падрыхтоўку. Не дапамаглі слонімцам і праведзеныя напрыканцы другога тайма замены.



У гульні навабранец "Камунальніка" Аляксандр Пазняк

Тым не менш, нулявая нічыя, якой скончыўся матч, перарвала серыю хатніх паражэнняў "Камунальніка" з "Бярозай".

Валерый КАВАЛЕНКА, Аляксандр ЗАХАРАНКА (статыстыка)

ВЫНІКІ АСТАТНІХ МАТЧАЎ 2-ГА ТУРА:

МТЗ-РЫПО — Тарпеда-Кадзіна,	2:1
Смаргонь — Дынама-Юні,	5:0
Днепр-ДЮСШ-1 — Вертыкаль,	0:0
Лакаматыў — Хімік,	1:1
Ведрыч-97 — Ліда,	3:1
ЗЛіН — Пінск-900,	2:0
Граніт — Нёман,	4:0

СТАТИСТИКА

ЦИФРЫ ПО ПОВОДУ

- «Коммунальник» прервал безвыигрышную домашнюю серию в матчах с «Березой», которая длилась с 12 сентября 1999 года.
- 30-й матч за клуб провел В.Цыганенко.
- На игре в Пинске 100-й матч в лиге сыграл А.Вольский, 60-й — Н.Остапчик.
- Из 216 матчей в I лиге в 71-й игре слонимчане покинули поле, не забив мяча.
- Команде не удалось забить 400-й гол в чемпионатах Беларуси (сейчас их 399).

Турнірная табліца пасля 2-га тура

		гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1.	Смаргонь	2	2	0	0	6	6-0
2.	ЗЛіН	2	2	0	0	6	3-0
3.	Граніт	2	1	1	0	4	4-0
4.	Камунальнік	2	1	1	0	4	1-0
5.	Ведрыч-97	2	1	0	1	3	3-2
6.	Ліда	2	1	0	1	3	3-3
7.	МТЗ-РЫПО	2	1	0	1	3	2-2
8.	Дынама-Юні	2	1	0	1	3	2-6
9.	Нёман	2	1	0	1	3	1-4
10.	Хімік	2	0	2	0	2	1-1
11.	Бяроза	2	0	2	0	2	0-0
12.	Днепр-ДЮСШ-1	2	0	2	0	2	0-0
13.	Вертыкаль	2	0	1	1	1	0-1
14.	Лакаматыў	2	0	1	1	1	1-3
15.	Тарпеда-Кадзіна	2	0	0	2	0	2-4
16.	Пінск-900	2	0	0	2	0	0-3



СОПЕРНИК

ОНИ НЕ ДАЛИ НАМ ВЫИГРАТЬ ДОМА

ФК «Береза» принял участие во всех чемпионатах Беларуси. В первой лиге играет с 1996 года. Провел 202 матча: +69=50-83, мячи 262:303.

Самое высокое место команда заняла в 1997 году — 4-е. В прошлом году клуб имел самый худший показатель своих выступлений в первой лиге — 15-е место.

Тренер березовской команды — Владимир Хныков. Костяк команды: Юрий Марченя (32 года, 139 игр в лиге, 2 гола), Святослав Заранко (32, 172, 4), Владимир Зубач (31, 191, 13), Владимир Бойко (30, 92, 1), Валерий Швед (30, 127, 31). Свой 28-й день рождения в Слониме отметил лучший бомбардир команды Николай Курилович (145, 57). Неплохо зарекомендовали себя в прошлом сезоне Дмитрий Гицелов (28, 72, 0), Андрей Гриневич (18, 50, 0), Сергей Шаман (22, 42, 0), Алексей Якубчик (22, 14, 2), Дмитрий Павлюкович (19, 19, 1) и Александр Белоглазов (19, 16,0).

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ. АНОНС.

ЕДЕМ К СОСЕДЯМ

«Неман» - «Коммунальник»

3 мая (суббота). Мосты. Стадион «Неман».

Баланс встреч: +2=0-4, мячи 4:9. (в Мостах — +2=0-1, мячи 2:1).

Последние игры: 25.5.02., Слоним — 1:4 (Белаш; А.Дегиль, Евсеенко, Вольский, Срибненко) 31.8.02., Мосты — 1:0 (Белаш).

Бомбардиры: Белаш — 2; О.Вербицкий — 2.

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ. АНГЛИЯ

ФУТБОЛИСТЫ АНГЛИЙСКОЙ ПРЕМЬЕР-ЛИГИ НАЗЫВАЮТ ЛУЧШИХ

Английская ассоциация футболистов-профессионалов назвала нападающего лондонского "Арсенала" Тьерри Анри футболистом года.

Среди номинантов также значились Рууд ван Нистелрой и Пол Скоулз (оба — "Манчестер Юнайтед"), Джеймс Битти ("Саутгемптон"), Алан Ширер ("Ньюкасл") и Джанфранко Дзола ("Челси"). 20-летнему полузащитнику "Ньюкасла" Джермену Дженасу, в свою очередь, досталось звание лучшего молодого игрока года.

Наконец, команду года составили вратарь Бред Фридель ("Блэкберн"); защитники Стефен Карр ("Тоттенхэм"), Эшли Коул, Сол Кэмпбелл (оба — "Арсенал"), Уильям Галлас ("Челси"); полузащитники Патрик Виейра, Робер Пирес (оба — "Арсенал"), Пол Скоулз ("Манчестер Юнайтед"), Кирон Дайер ("Ньюкасл"); нападающие Алан Ширер ("Ньюкасл") и Тьерри Анри ("Арсенал").

news.sport-express.ru

ГРЕБЛЯ

НА ТРЕТЬЕМ МЕМОРИАЛЕ НИКОЛАЯ ДУБРОВСКОГО

Третий Мемориал памяти Николая Николаевича Дубровского провели слонимские гребцы в прошедшую среду.

Николай Николаевич, бывший директор гребной школы, около 30 лет своей жизни отдал гребле на байдарках и каноэ. Его воспитанники показывали высокие спортивные результаты.

Поэтому и сегодняшнее поколение гребцов постаралось не ударить в грязь лицом. В программе соревнований прошло личное первенство по гребле на байдарках и каноэ в трех возрастных группах.

Среди юниоров 1985-86 годов рождения в байдарке-одиночке на дистанциях 500 м и 2 000 м первенствовал мастер спорта Дмитрий Лойко (СШ №5). На этих же дистанциях среди ребят 1987-88 годов рождения не было равных кандидату в мастера спорта Василию Меркуну (СШ №5). И 500-метровку, и 2-километровую дистанцию среди гребцов 1989-90 годов рождения выиграл кандидат в мастера спорта Юрий Русенко (СШ №10).



Три победителя на слонимской воде

В каноэ-одиночке победителями становились Олег Тяпкин (1985-86 гг. р., первый разряд, СШ №5) на дистанции 500 м и Евгений Герасимчик (1985-86 гг. р., кандидат в мастера спорта, СШ №7) на 2 000 м. В возрастной группе 1987-88 гг. р. обе дистанции (500 м и 2 000 м) выиграл кандидат в мастера спорта Виталий Прокофьев (СШ №3), а среди ребят 1989-90 гг. рождения спортивное счастье дважды было на стороне Алексея Маслова (кандидат в мастера спорта, СШ №10).

Победители Мемориала памяти Николая Дубровского занимаются у тренеров Слонимской СДЮШОР №2 В. Лойко и М. Миронова.

Валерий КОВАЛЕНКО

СКОРО В АРМИЮ

ЧЕТВЕРТЫЕ СРЕДИ ДВАДЦАТИ КОМАНД ОБЛАСТИ

18-19 апреля в Гродно прошла областная спартакиада по летнему многоборью — «Защитник Отечества». В соревнованиях приняли участие 20 команд из Гродненской области.

В комплекс соревнований входили стрельба, подтягивание на перекладине, метание гранаты, бег на 100 и 3 000 метров, плавание.

После первого вида состязаний — стрельбе из пневматической винтовки — сборная Слонимского района занимала 10-е общекомандное место.

В итоге же, слонимчане сумели занять лишь четвертое место в спартакиаде.

На первом месте — команда Гродненского района.

Второе и третье места поделили сборные Мостовского района и Октябрьского района г. Гродно.

Более ста участников соревнований боролись и за победу в личном первенстве.

Вплоть до последнего вида программы на третьем месте располагался Павел Линго (Жировичский агротехнический колледж, ЖАТК). Но, набрав малое количество очков в плавании, Павел в итоге поделил лишь 6-7 места.

По мнению руководства отдела по физической культуре, спорту и туризму Слонимского райисполкома, наша команда выступила на областной спартакиаде успешно.

А в состав сборной Слонимского района входили Павел Линго, Дмитрий Конева, Юрий Полыко (все — ЖАТК), Александр Бойдаков (СШ №9), Александр Пигулевский (Новоселковская СШ) и Сергей Чайковский (Новодевятковичская СШ).

Александр ЗАХАРЕНКО

ФУТБОЛ. ВЫСШАЯ ЛИГА

СЫГРАН ОЧЕРЕДНОЙ ТУР ЧЕМПИОНАТА ПО ФУТБОЛУ

В субботу, 26 апреля, прошли матчи третьего тура чемпионата Беларуси по футболу в высшей лиге. Напомним, что первый тур (12 апреля) был перенесен из-за неблагоприятных погодных условий.

БАТЭ (Борисов) — Гомель — 0:0;

Динамо (Минск) — Неман (Гродно) — 0:0

Торпедо-СКА (Минск) — Нафтан (Новополоцк) — 1:1 (Наумов, 49-п; Бычинский, 30).

Дарида (Ждановичи) — Звезда-ВА-БГУ (Минск) — 2:2 (Кузьминич, 5, Трунин, 53; Скверню, 15, Папкович, 65).

Молодечно-2000 — Белшина (Бобруйск) — 1:0 (Ольховик, 51-п).

Днепр-Трансмаш (Могилев) — Шахтер (Солигорск) — 1:0 (Боровицкий, 57).

Славия (Мозырь) — Локомотив (Минск) — 0:2 (Кашевский, 50, Денисюк, 82).

Динамо (Брест) — Торпедо (Жодино) — 0:2 (Шуманский, 52, Мархель, 88).

После двух сыгранных туров лидирует жодинское "Торпедо", у которого в активе 6 очков, далее расположились: "Динамо" (Минск), "Локомотив", "Нафтан", "Гомель" — по 4; "Динамо" (Брест), "Днепр-Трансмаш", "Молодечно" — по 3, "Неман", "Торпедо-СКА", БАТЭ — 2, "Дарида", "Белшина", "Шахтер", "Звезда-ВА-БДУ" — 1, "Славия" — 0.

Олег РАЕВЕЦ

БОКС

НА МЕЖДУНАРОДНОМ РИНГЕ НЕ ПОТЕРЯЛИСЬ



Тренер Валерий Торжецкий и его ученик, победитель турнира в Польше, Алексей Бондаловский

Международный молодежный турнир серии «А» имени Михала Штэфана собрал 25-27 апреля в Варшаве около 80 боксеров 1985-86 годов рождения из Украины, Литвы, Канады, Беларуси и Польши.

Удачно на этих соревнованиях выступил слонимский боксер, воспитанник тренера Валерия Торжецкого, Алексей Бондаловский (СШ №2). В весовой категории 81 кг, в которой выступал Алексей, было заявлено восемь спортсменов. Поэтому слонимчанину пришлось провести три боя. В первом бое Алексей Бондаловский победил поляка, во втором — литовского боксера.

Финальный бой Алексей проводил с канадцем и одержал победу по очкам. Победитель был награжден дипломом турнира, золотой медалью и Кубком.

Одновременно с турниром в Польше проходили соревнования в Барановичах. В этом турнире принимали участие боксеры из России (Славгород, Черняховск), Молдовы, Украины (Киев, Белая Церковь) и Беларуси. Слоним на соревнованиях представляли шесть спортсменов 1987-88 годов рождения. Лучшие результаты показали двое из них.

Воспитанники тренера Валерия Торжецкого Андрей Осипов (весовая категория 75 кг) и Виталий Дударчик (76 кг) проиграли финальные бои и заняли вторые места.

Валерий КОВАЛЕНКО

ХРОНИКА

ИРАКСКИХ ФУТБОЛИСТОВ ПЫТАЛИ

По сообщению американского журнала Time, футболисты сборной Ирака подвергались пыткам, санкционированным сыном Саддама Хусейна - Удаем, занимавшим пост главы Олимпийского комитета Ирака и национальной футбольной федерации.

По свидетельству издания, неудачно сыгравшим футболистам обваривали ноги и вырывали ногти. Более того, в субботу на территории места проживания Удая, неподалеку от офиса федерации футбола, было обнаружено орудие пыток, сильно напоминающее средневековую "Железную деву".

news.sport-express.ru

ЧЕМПИОН ЗАДЕРЖАН ПОЛИЦИЕЙ

Девятикратный олимпийский чемпион американец Карл Льюис в понедельник был задержан полицией Лос-Анджелеса.

Стражи порядка остановили его "Мазерати", обратив внимание на внешние повреждения машины. При этом уровень алкоголя в крови 41-летнего экс-спортсмена оказался выше допустимого. По версии следствия, учитывая характер повреждений автомобиля, Льюис мог задеть шумопонижающую стену ограждения шоссе. Сам бывший легкоатлет не пострадал и вскоре был выпущен на свободу.

news.sport-express.ru

ШАШКІ

СЛОНІМСКІЯ ПРЫЗЁРЫ АБЛАСНОЙ СПАРТАКІЯДЫ

У Гродне адбыліся фінальныя спаборніцтвы на прызы клуба "Цуда-шашкі" у праграме абласной спартакіяды вучнёўскай моладзі.

У іх прынялі ўдзел сем каманд — пераможцаў занальных турніраў. Вельмі ўпартая барацьба ішла літаральна да апошняй сустрэчы.

У выніку, пераможцай стала каманда Ваўкавыска, на адно ачко апярэдзіўшая шашыстаў Гродна і на два — каманду Слоніма. У складзе трэціх прызёраў спартакіяды гулялі: Маргарыта Батура і Андрэй Мацявін (СШ № 9), Максім Кандзіранда і Юрый Сегень (СШ № 8).

Аляксандр ЗАХАРАНКА

ФУТБОЛ

ПРАВИЛО "СЕРЕБРЯНОГО ГОЛА"

Европейский футбольный союз, начиная с финалов Лиги чемпионов и Кубка УЕФА этого года, вводит правило "серебряного гола".

Ранее, по правилу "золотого гола", при забитом в дополнительное время голе игра немедленно прекращалась. По новому правилу, у пропустившей в дополнительное время команды будет шанс отыграться — до конца того дополнительного тайма, в котором был забит "серебряный гол".

Reuters

ПОЭЗІЯ

Віктар НОВІК

І жартам, і ўсур'ёз

Зіначка

Майстрам Зіначка працуе,
Зла ў душы не мае,
І таму жаночы стан
Юра абдымае.

Дакранецца ледзь рукой
Да пляча маўклівa,
І паўзе рука ніжэй,
Усё хутчэй, імклівей.

"Стой жа, хопіць, анямей,
Не паўзі ж ты, годзе!" —
Зінка руку адвядзе,
Бо рука у шкодзе.

Чаканне

Вымываецца кот на парозе.
Мабыць, госці
прыедуць да маці:
Зяць, дачка,
брат старэйшы й яшчэ
Два маленькія іх дзіцяняці.

Праглядзела ўжо вочы
матуля ў акне,
Пільна сочыць,
дзяцей выглядае.
Вось аўтобус прыйшоў —
і нікога нідзе...
Кот мясціну адну дамывае.

АПАВЯДАННЕ

МАЦЕЙ І МІКІТА

Мацей і Мікіта жывуць у розных канцах вёскі, таму аднавяскоўцы і празвалі іх канцавымі. Але адлегласць не шкодзіць іхняму сяброўству, якое мае даўнія глыбокія карані. Яшчэ прадзеды і прапрадзеды іхнія сябравалі. Род Мікіты быў шляхетнага паходжання, і яго прашчуры здаўна хадзілі ў галёшах. А Мацей паходзіў з мужыкоў, і яны вечна насілі лапці. Але адны перад другімі ніколі носа не задзіралі, і часта шляхцюкі ў галёшах хадзілі да мужыкоў пазычыць грошы. Так было раней. Міналі гады, а сяброўства перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Аднойчы сустрэў Мікіта Мацея і запрасіў у госці.

Раз госць у хаце — не марудзь. Пляшку з паліцы на стол, патэльню з печы з грыбамі таксама — вось і абед. Пакуль не ачысцілі патэльню, з-за стала не ўсталі. А пасля Мікіта і хваліцца:

— Учора, каровы пасучы, натрапілі на такую грыбную мясціну — што ні пень, то цэлая капа! Я кашулю і куртку з сябе скінуў, а жонцы не было ў што збіраць, то яна панталоны з сябе сцягнула, гумкі ў калошах падвязала і напакавала іх, як падняць.

Пачуўшы такое, Мацей кулём выкаціўся на двор, і ўсе апенькі засталіся за плотам. А ў вёсцы з'явілася прымаўка: "Наеўся, як Мацей апенек у Мікіты!".

Не пазней як праз год Мацей запрасіў у госці Мікіту. Пасадзіў яго на покуце, як самага шаноўнага госця, а сам палез у печ, выняў віламі чыгунок, накрыты скавародкай, а калі зняў покрыўку, адтуль пара як дасць у нос. Ды так запахла смажанінай, што забурчэла ў жываце.

Выпілі чарку, другую. Мацей падкладвае Мікіту кавалачак за кавалачкам, а сам і аднаго не з'еў, а толькі хваліць зайчаціну. Апусцеў чыгунок. Мікіта ўзяў акрайчык хлеба, вымазаў яго, аблізаў вусны, крэкнуў з задавальненнем і пытае ў Мацея:

— Дзе ж ты яго ўпаляваў?

— Ды на прыгуменні, — адказвае Мацей, — саджанцы ўнадзіліся абгрызаць. А я як прыладзіўся, як пеканў, ён аж мяўкнуў!

Мікіта пасля апошніх слоў стрымгалоў на двор паляцеў, і ўвесь заяц, які мяўкаў, апынуўся на градах у Мацея. А па вёсцы пайшоў праклён: "Каб ты ката з'еў, як Мікіта ў Мацея!" Праўда, прамаўлялі яго не ад злосці, а жартуючы.

А Мікіта з Мацеем сябруюць і сёння.

Мікола ГРЫШАН

Фота Віталя ГІЛЯ

ПРОГНОЗ ПОГОДЫ
по Гродненской области

30 апреля:
Переменная облачность. Ночью кратковременный дождь. Днём преимущественно без осадков. Ветер западный 5-10 м/с, ночью при грозе местами шквалистое усиление до 15-20 м/с. Температура воздуха ночью +8+13, днём +16 +21.

1 мая:
Облачно с прояснениями. Ночью на большей части, днём местами кратковременные дожди, грозы. Ветер южный с переходом на западный 4-9 м/с, порывы до 14 м/с. Температура воздуха ночью +8+13, днём +11 +16.

2 мая:
Облачно с прояснениями. Преимущественно без осадков. Ветер южный с переходом на западный 4-9 м/с. Температура воздуха ночью +8+13, днём +15+20.

Информацию предоставил Гродноoблгидрометцентр

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар ВАЛАДАШЧУК

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК
НАМЕСНІК ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА Сяргей ЧЫГРЫН
АДКАЗНЫ САКРАТАР Мікола КАНАНОВІЧ
ЖУРНАЛІСТЫ Вольга ШЫНКЕВІЧ, Валерый КАВАЛЕНКА
ФОТАКАРЭСПАНДЭНТ Віталь ГІЛЬ
АДДЗЕЛ РЭКЛАМЫ Загадчык: Ганна ВАЛАДАШЧУК; Рэкламны агент: Андрэй ЕРАМЕЙЧЫК
ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР Аляўціна СІДАРАВА
БУХГАЛТАР Ганна ВАРАНОВІЧ
ВЁРСТКА І ДЫЗАЙН Аляксей ГАРАЙНАЎ, Сяргей КОПАЦЬ
КАРЭКТАР Галіна КЛІНЦЭВІЧ
АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ І РАСПАЎСЮДЖВАННЯ Загадчык: Анатоль ВАЛАДАШЧУК; Супрацоўнік: Віктар ЧАРНОЎ

Тэлефоны рэдакцыі:
2-14-39, 2-49-39, 4-79-34

Наш адрас:
231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.

e-mail: gs@promedia.by
http://gs.promedia.by

АДДЗЕЛ РЭКЛАМЫ ПРАЦУЕ:
Панядзелак - пятніца з 9⁰⁰ да 18⁰⁰;
Нядзеля з 11⁰⁰ да 16⁰⁰
Выхадны — субота

Апошні тэрмін падачы рэкламы ў чарговы нумар і ўнясення змяненняў у рэкламу **Панядзелак — 18⁰⁰**

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

Падпісана да друку
29 красавіка 2003г.
Час падпісання 18:00.
Заказ № **1461**

Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня",
г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.
Аб'ём – сем друкаваных аркушаў